Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-06-19

Выстаўка працуе па 21 чэрвеня.

✓ 12 чэрвеня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі** старшага навуковага супрацоўніка аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі к.г.н., дацэнта **Анастасіі Скеп'ян «Князі Слуцкія»**, што выйшла летась у выдавецтве «Беларусь» у серыі «Беларуская гісторыя».

Манаграфія А. Скеп'ян «Князі Слуцкія» стала вынікам шматгадовай працы, пад час якой былі выяўленыя новыя архіўныя, маладомыя звесткі. Яны дазволілі перагледзець традыцыйны погляд на ролю, якую адыгралі прадстаўнікі роду Алелькавічаў-Слуцкіх у грамадстве XV – XVI стст.

Да прэзентацыі прымеркаваная **выстаўка «Слуцк і яго ўладары»**, на якой экспануюцца выданні XVI – XXI стст. з фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. Сярод іх – дакументы, якія сведчаць пра ўзнікненне і развіццё Слуцка, пра гісторыю яго ўладальнікаў – князёў Алелькавічаў, адлюстроўваюць розныя бакі грамадска-палітычнага жыцця тых часоў.

Наведнікі таксама могуць пазнаёміцца з навуковымі публікацыямі аўтара: аўтарэфератам дысертацыі, артыкуламі ў зборніках навуковых прац, матэрыялах канферэнцыяў і перыядычных выданнях.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні...